ДУА
«ЕЛКАЎСКАЯ
СЯРЭДНЯЯ
ШКОЛА»

# РЭХА ШКОЛЬНАГА ЖЫЦЦЯ

Агульнашкольная газета Красавік 2021 Выпуск № 8

**Звярніце увагу:**

- 23% тэрыторыі краіны
- Інфармацый-ная гадзіна “Чарнобыль

**У гэтым нумары:**

Чарнобыль. Хронікі. Падзеі. Факты 1
Чарнобыль. Хронікі. Падзеі. Факты 2
Чарнобыль. Хронікі. Падзеі. Факты 3
Конкурс лістовак 4

## Чарнобыль. Хронікі. Падзеі. Факты

1970, сакавік – пачатак будаўніцтва Чарнобыльскай атамнай станцыі.
1977 – першы з чатырох рэактараў увайшоў у строй.
25 красавіка 1986– у зале кіравання чацвёртым энергаблокам кіпела работа. Тут рыхтаваліся да правядзення вопыту, да праверкі работы рэактара ў незвычайных умовах. Каб стварыць такія ўмовы, работнікі станцыі адключылі ўсе сістэмы аховы рэактара ад выбуху.
26 красавіка 1986 года, субота. 01 гадзіна 23 хвіліны - выбух на ЧАЭС. Выбух рэактара. 190 тон паліва, цалкам або з прадуктамі дзялення, з рэактарнай графітам, рэактарнага матэрыяламі выкінула з шахты рэактара.
Прадстаўнікі самых розных прафесій праявілі самаахвярнасць у першыя гадзіны і дні, не дапусцілі пашырэння маштабаў аварыі. Першасны аналіз сітуацыі паказаў, што непасрэдна ад выбуху ўздзеянню радыяцыі падверглася паўднёвая частка Беларусі.
У выніку на тэрыторыю Беларусі прыйшлося 70% усяго радыеактыўнага забруджвання. У гэтай зоне апынулася каля 2 млн. 100 тыс. чалавек (25% беларускага насельніцтва).
Развіццё падзей прымусіла кіраўніцтва рэспублікі прыняць 4 мая 1986 г. рашэнне аб адсяленні насельніцтва з 30-кіламетровай зоны навокал ЧАЭС, у пяршую чаргу з Брагінскага, Хойніцкага І Нараўлянскага раёнаў.
У выніку аварыі небяспечнымі радыенуклідамі забруджана 23% тэрыторыі краіны
Аварыя разбурыла ўклад жыцця соцень тысяч людзей і нарадзіла пастаянны стрэс у насельніцтва. Забруджаныя раёны пакінулі 335 тыс. чалавек, ліквідавана 415 населеных пунктаў, 607 школаў і дашкольных установаў, 97 бальніц.

26 красавіка 2021 г. чалавецтва адзначае 35 гадоў Чарнобыля! 35 гадоў! Чорны юбілей трагедыі. Юбілей, які не святкуюць, але які трэба памятаць.

Споўнілася чарговая гадавіна Чарнобыльскай аварыі. Аварыі, якая стала грозным папярэджаннем чалавецтву.

У нашай школе таксама не засталіся ў баку ад гэтай падеі. На працягу з 20 па 29 красавіка праводзілася дэкада, прысвечаная гэтай жудаснай трагедыі. Вучні ўсіх класаў прынялі актыўны ўдзел у мерапрыемствах, якія праводзіліся.

Так, малодшыя школьнікі выказвалі свае пачуцці праз колеры. Цікавай і арыгінальнай атрымалася выстава малюнкаў “Героем можна быць і ў мірны час”. Вучні старэйшых класаў жыва і эмацыянальна абмяркоўвалі кінафільм “Чарнобыль – хроніка цяжкіх тыдняў”.

У дзень трагедыі 26 красавіка была праведзена адзіная інфармацыйная гадзіна “Чарнобыль. Ад пераадолення наступстваў аварыі да дынамічнага развіцця рэгіёнаў, якія пацярпелі ад аварыі”. Класныя кіраўнікі правялі для навучэнцаў сваіх мерапрыемствы, дзе асвяцілі хроніку падзей аварыі, успомнілі герояў-пажарных, акрэслілі трагедыю лёсаў людзей, якія апынуліся ў зоне бедства.





Вучні старэйшых класаў жыва і эмацыянальна абмяркоўвалі кінафільм “Чарнобыль – хроніка цяжкіх тыдняў”.

У дзень трагедыі 26 красавіка была праведзена адзіная інфармацыйная гадзіна “Чарнобыль. Ад пераадолення наступстваў аварыі да дынамічнага развіцця рэгіёнаў, якія пацярпелі ад аварыі”. Класныя кіраўнікі правялі для навучэнцаў сваіх мерапрыемствы, дзе асвяцілі хроніку падзей аварыі, успомнілі герояў-пажарных, акрэслілі трагедыю лёсаў людзей, якія апынуліся ў зоне бедства. Ні адзін удзельнік і глядач, вучань ці дарослы не застаўся абыякавым. Кожны зрабіў для сябе нейкі вывад.



Чарнобыль увайшоў у гісторыю не толькі як вынік грубых памылак людзей і недасканаласці сістэмы, але і як суровае папярэджанне чалавецтву. Ён высветліў яшчэ адну важную ісціну - ці захаваем прыроду планеты, нашага агульнага дома, а значыць і сваю будучыню, залежыць ад кожнага з нас. Аўтар:

Семенюк І., 9 класс

## Конкурс лістовак










